1. Матіос М. Вибране / Марія Матіос. – Львів : ЛА «Піраміда», 2010. – 424 с.
2. Наливайко Д. С. Очима Заходу. Рецепція України в Західній Європі XI–XVIII ст. / Д. С. Наливайко – К. : Основи, 1998. – 578 с.
3. Наливайко Д. С. Літературознавча імагологія: предмет і стратегії / Д. С. Наливайко // Літературна компаративістика. – 2005. – Вип.1– С. 27–44.
4. Ощепков А. Р. Имагология / А. Р. Ощепков // Знание. Понимание. Умение. – 2010. – № 1 – С. 251–253.
5. Словник української мови : в 11 т. / за ред. І. К. Білодіда. – К. : Наук. думка, 1970–1980. – Т. 11. – 1980. – 687 с.
6. Степанов Ю. С. Константы. Словарь русской культуры / Ю. С. Степанов. – М. : Шк. «Языки русской культуры», 1997. – 824 с.
7. Грушевицкая Т. Г. Основы межкультурной коммуникации : учеб. для вузов [Электронный ресурс] / А. П. Садохин, Грушевицкая Т. Г., Попков В. Д. ; под ред. А. П. Садохина – М. : ЮНИТИ–ДАНА, 2002. – 352 с.– Режим доступа : http://www.countries.ru/library/intercult/svch.htm
8. Солодка Даруся [Електронний ресурс]. – Режим доступу : http://uk.wikipedia.org/wiki/solodka_darucia

**Якимович Виктория. Имагологический дискурс романа Марии Матиос «Сладкая Даруся»: инонациональная проблематика.** В статье анализируются особенности имагологического дискурса романа Марии Матиос «Сладкая Даруся». Акцентируется на значении понятия «чужой» как чужеродный, иностранный. Сделаны выводы о неоднозначном отношении героев произведения к оккупационной власти поляков, румын, немцев и «советов».

**Ключевые слова:** Мария Матиос, роман «Сладкая Даруся», имагологический дискурс, «свой», «чужой», чужеродный, село Черемошное, оккупационная власть, Буковина.

**Yakymovych Victoria. Imagological Discourse of the Novel «Solodka Darusya» by Maria Matios: Problems of Other Nations.** The peculiarities of imagological discourse of the novel «Solodka Darusya» by Maria Matios. The meaning of «foreign» as strange, alien is emphasized. The conclusions about the ambiguous attitude of heroes to the occupation authorities of Poles, Romanians, Germans and «Soviets» are made.

**Key words:** Maria Matios, «Solodka Darusya», imagological discourse, not foreign, strange, foreign, Cheremoshne village, occupation authorities, Bukovyna.

Статтю подано до редколегії
25.02.2013 р.

УДК 821.161.3-19:09

**Елена Ярмоленка**

# Біблія ў творчасці класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага

У артыкуле прааналізаваны ўплыў біблейскай традыцыі на форму і змест драматычнай аповесці «Антон». Вызначаны асноўныя хрысціянскія архетыпы і іх роля ў мастацкай канцэпцыі класіка.

**Ключавыя словы:** Біблія, архетып, вера, адзінота, душа, грэх, царква, драма, пекла.

**Пастаноўка навуковай праблемы і яе значнасць**. На працягу стагоддзяў Біблія была і застаецца асноўнай крыніцай натхнення сусветнай мастацкай літаратуры. Вытокі фарміравання і працэсы развіцця беларускай літаратуры, у сваю чаргу, таксама цесна звязаны з біблейскай традыцыяй. Актуальнай праблемай сучаснага літаратуразнаўства з’яўляецца даследаванне выкарыстання біблейскіх архетыпаў і вобразаў у цэлым і, у прыватнасці, у творчасці асобных пісьменнікаў. Надзвычай цікавы матэрыял для даследавання ўяўляе сабой творчасць класіка беларускай літаратуры М. Гарэцкага (1893–1938). У сувязі з тым, што Гарэцкі, як і многія прадстаўнікі інтэлігенцыі, у 1930-я гг. быў беспадстаўна рэпрэсаваны, празаічныя творы пісьменніка знайшлі свайго чытача толькі пачынаючы з 1960-х гг. Зварот даследчыкаў, літаратуразнаўцаў і культуролагаў да біблейска-хрысціянскай традыцыі ў творчасці пісьменніка распачаўся толькі ў другой палове 1990-х гг. і прадстаўлены навуковымі артыкуламі Г. Кажамякіна «Максім Гарэцкі і Біблія», У. Конана «Міфалагічныя і біблейскія вобразы і матывы ў творчасці Макіма Гарэцкага» і М. Кенькі «М. Гарэцкі і вера». У згаданых артыкулах звяртаецца ўвага на

*© Ярмоленка Е., 2013*

сувязь твораў пісьменніка са свяшчэнным пісаннем, прыведзены прыклады выкарыстання біблейскіх архетыпаў, даследуецца пытанне веры ў жыцці М. Гарэцкага.

Так М. Кенька сцвярджае: «У жыцці і творчасці Максіма Гарэцкага можна прасачыць яго пастаянныя пошукі духоўнага апірышча чалавека, таго, дзеля чаго варта і трэба жыць, пошукі адказу на пытанне, што ёсць чалавек у гэтым свеце. І ў гэтых пошуках паняцце веры як ідэі, сэнсу жыцця і прызнанне, што гэтым сэнсам апякуюцца і звышнатуральныя сілы, непадуладныя чалавечаму розуму, то ідуць паралельна, то сыходзяцца» [3, с. 66].

У. Конан у сваім артыкуле змяшчае пералік біблейскіх вобразаў у творчасці пісьменніка: «Паказальнік біблейскіх архетыпаў, міфалагічных вобразаў і матываў у творчасці Максіма Гарэцкага» [4, с. 135], у якім называе архетыпы апраметнай і Антыхрыста сярод выкарыстаных пісьменнікам у драматычнай аповесці «Антон».

Г. Кажамякін, аналізучы сувязь жыцця і творчасці М. Гарэцкага з Бібліяй, адзначае: «У шэрагу твораў М. Гарэцкага прасочваецца сувязь з свяшчэнным пісаннем Хрысціянаў – Бібліяй, якую ён называў “вялікай кнігай старажытнае мудрасці”. Гэта выяўляецца або праз выказванне самога аўтара на рэлігійную тэматыку, праз успрыманне персанажам Бога, спробы асэнсавання таямніцаў, звязаных з рэлігіяй або праз уплыў самой Кнігі жыцця на творы пісьменніка» [2, с. 330].

Як паказваюць сучасныя даследаванні жыцця і творчасці пісьменніка, дзейнасць яго была цесна звязана з праваслаўнай духоўнай традыцыяй. Гэта сувязь не магла не адбіцца на творчасці М. Гарэцкага, даследаванне спадчыны якога немагчыма без узнаўлення аўтэнтычных біблейскіх тэкстаў, якія ён шырока выкарыстоўваў у сваіх апавяданнях, аповесцях і драматычных абразках. Узнаўленне хрысціянскай традыцыі і вызначэнне ролі Бібліі ў мастацкіх творах празаіка было немагчама ў савецкі перыяд развіцця гарэцказнаўства, таму на сённяшні дзень надзвычай актуальнай задачай літаратуразнаўцаў з’яўляецца пераасэнсаванне творчай канцэпцыі аўтара, аснову якой складалі бесперапынныя пошукі духоўнасці і веры.

**Выкладанне асноўнага матэрыялу і абгрунтаванне атрыманых вынікаў даследавання.** Пытанне веры з’яўляецца асноўнай праблемай, якой прысвечана драматычная аповесць М. Гарэцкага «Антон» (1914). Крытыка, традыцыйна выкарыстоўваючы класавы падыход, акцэнтуе ўвагу на сацыяльным канфлікце паміж багатымі і беднымі, асэнсоўвае пытанні зямлі і волі, палітычнай свабоды і справядлівасці, узаемаадносін бацькоў і дзяцей. Але на нашу думку, аснову ідэйнай канцэпцыі аўтара складае вырашэнне праблемы існавання веруючага чалавека ў грэшным свеце, спроба стварыць беларускага князя Мышкіна, чалавека выключных маральных якасцей, які, як і герой Ф. М. Дастаеўскага, павінен прайсці выпрабаванні зямнога жыцця. Гэтай мастацкай задуме прысвечаны форма і змест незвычайнага твора М. Гарэцкага, які адлюстроўвае жыццё амаль усіх прадстаўнікоў грамадства пачатку ХХ ст. на тэрыторыі Беларусі.

Асноўнай праблемай драматычнай аповесці з’яўляецца духоўная адзінота веруючага чалавека ў бездухоўным грамадстве. Усе вышэйадзначаныя тэмы: сацыяльнай справядлівасці, зямлі і волі, бацькоў і дзяцей, вынікаюць з гэтай праблемы. Канфлікт веры і бязвер’я ў аповесці закранае ўсе сацыяльныя групы грамадства пачатку ХХ ст. Перад чытачом паўстае галерэя чалавечых вобразаў, якія сімвалізуюць амаль усе біблейскія грахі. Галоўны герой Антон Жабон трапляе ў сапраўднае пекла, з якога не бачыць выйсця, акрамя здзяйснення забойства і самагубства. Дзякуючы драматычнай форме, напружанасць канфлікту ўзрастае з кожнай часткай твора, пакуль не выліваецца ў жудасную індывідуальную катастрофу чалавека высокіх маральных якасцей. Катастрофу, якая праходзіць для мітуслівых і абыякавых людзей амаль незаўважнай, але прадказвае крызіс духоўнасці, які зацягнуўся на многія дзесяцігоддзі і зараз застаецца непераадоленым.

Ужо ў першай частцы аповесці адбываецца завочнае знаёмства чытача з галоўным героем апавядання. Аўтар малюе райскую карціну прыгожага без меры саду паноў Іванецкіх, якая традыцыйна можа быць фонам пастаральнай ідыліі са шчаслівым канцом. На самой справе сярод вонкавай раскошы пануе фанабэрыя, сквапнасць і распуста, якая яскрава праяўляецца ў дыялогу пані Іванецкай і яе пляменніцы Клавы з леснікам, бацькам Антона. Прагная пані шкадуе кожны кошык суніц, які назбіраюць сяляне ў яе лесе, а маладая паненка цікавіцца толькі гульнямі ў любоў, нават жартаўліва заляцаецца да старога лесніка. І вось гэтыя людзі абмяркоўваюць галоўнага героя, называюць яго дурным і няўдалым, за тое, што той выступае супраць самадурства паноў і свайго бацькі.

Наступная дзея драмы разгортваецца ў карчме, якая з’яўляецца сімвалам гэтай забітай, беднай, няшчаснай старонкі, дзе, па словах пані, мужыкі могуць быць толькі п’яніцамі, карцёжнікамі і злодзеямі. Такія злодзеі і сабраліся ў карчме, каб абмеркаваць разам з Аўтухом планы крадзяжу дубкоў з лесу пані. Ужо з першых старонак апавядання пісьменнік знаёміць чытача з тыповымі прадстаўнікамі беларускага грамадства. Сістэма персанажаў пабудавана так, каб праз дыялог і аўтарскія рэмаркі паказаць іх характэрныя рысы, іх паўсядзённае жыццё. З дня ў дзень, амаль механічна, не задумваючыся, яны парушаюць біблейскія запаветы і лічаць сваё існаванне ўзорам для іншых, асуджаючы дурнога Антона. П’янства і распуста, ганарыстаць і сквапнасць – вось асноўныя грахі, супраць якіх выступае галоўны герой. Яго характарыстыку аўтар падае толькі ў трэцяй частцы, дзеянне якой адбываецца ў царкве. Выбар месца сустрэчы з галоўным героем зусім не выпадковы, бо царква сапраўды храм Божы для Антона, а слова бацюшкі – Боскае слова. Нават аблічам, па словах аўтара, Антон падобны да Хрыста на абразах. І вось калі душа веруючага чалавека засяроджана размаўляе з Богам, астатнія вернікі і нават дзяк вырашаюць у царкве асабістыя праблемы. Маладыя дзяўчыны ў час службы абмяркоўваюць знаёмых і заляцаюцца да кавалераў, дзяк расказвае гімназісту, што святы ацец – атэіст. Дзяк і гімназіст здзекуюцца з веры галоўнага героя, называюць яго забабонным мужыком, мужыцкім чортам з рагамі, а самі ў час пропаведзі разглядаюць паненак і абмяркоўваюць перспектывы жаніцьбы на багатай шляхцянцы. Пропаведзь бацюшкі слухае адзін Антон, астатнія заняты сваімі грэшнымі справамі. Створаны кантраст дазваляе акрэсліць згаданы канфлікт аповесці – вера і бязвер’е. Шчырая малітва Антона, яго адухоўленае аблічча рэзка супрацьпастаўлены плёткам і пустым словам натоўпу. Менавіта ў трэцяй дзеі адбываецца завязка драмы. Веруючы чалавек уражаны словамі святара, што за грахі бацькоў будуць адказваць іх дзеці ў сёмым калене. Ён адразу ўяўляе, як будуць пакутаваць нявінныя дзеці за грахі яго бацькі Аўтуха, а самае галоўнае не бачыць паратунку ад пакут акрамя смерці. З такімі думкамі выходзіць галоўны герой з царквы, і гэтыя думкі прыводзяць яго да забойства свайго сына і самазабойства.

У чацвёртай частцы раскрываецца адданая вера Антона ў Бога, замілаванне і радасць, якія ахопліваюць яго ў царкве, у час шчырай малітвы. Душа героя трывожыцца аб уласных грахах, аб жыцці, у якім мала духоўнасці і веры, аб бясконцай барацьбе з п’янствам бацькі. Думкі Антона зноў і зноў вяртаюцца да грахоў чалавецтва і пакарання за грахі. Нездарма са старонак аповесці паўстае біблейскае апісанне пекла, якога не мінаваць, па меркаванню галоўнага героя, нікому: «Антон задумаўся; думкі яго паляцелі туды, дзе жудасны Копша складае торпы касцятрупаў, а дзе калісьці рагатыя з бізунамі, хвастатыя, капытатыя на тонкіх ножках і са свінымі лычамі гоняць звязаных ланцугамі людзюхнаў у... агонь, неўгасімы... Усе тут ёсць: і каралі, і царыцы, і міністры, і генералы, і губернатары, і паны, і папы, і жыды, і цыганы, і ўсякія другія народы, і мужыкі, і бабы, маламожныя, і заможныя, і ўсякія, усякія. І тыя, што бацек пе шанавалі, і тыя, што дзетак распусцілі, і тыя, што бога не баяліся, у сераду, у пятніцу мяса елі, дарма кляліся, з чужымі жонамі распусту рабілі, і што нюхалі, і курылі... і... Божа, божа!» [1, с. 213].

Гэта празмерная чуллівасць і ўражлівасць дазваляюць герою востра адчуваць неадпаведнасць рэальнага света свету ідэальнаму, боскаму. Ён горача асуджае сябе за кожную маленькую правіннасць і хваравіта перажывае грахі іншых. Хваляванні Антона застаюцца незаўважнымі для іншых персанажаў аповесці. У той жа час менавіта іх паўсядзённыя ўчынкі ўплываюць на канчатковы выбар Антона паміж жыццём і смерцю.

Наступныя часткі драматычнай аповесці прысвечаны замалёўкам з жыцця дарэвалюцыйнай вёскі, тым здарэнням, якія прыводзяць да крывавай развязкі драмы. Час сціскаецца да некалькіх дзён, прастора дзеяння канцэнтруецца вакол хаты Аўтуха і Антона Жабонаў, дзе адбываюцца асноўныя падзеі твора. Іх перадача пабудавана на супрацьпастаўленні і перамежкавым адлюстраванні дзеяння. Супрацьпастаўлена грэшнае і мітуслівае вясковае існаванне і духоўнае жыццё Антона. Сваркі з бацькам чаргуецца са шчырай працай і малітвай, марамі аб лепшым жыцці. Цікава, што надзею на выратаванне ад духоўнай адзіноты ў пекле жыцця не могуць даць нават старцы, якія традыцыйна ў беларускім фальклоры і літаратуры асэнсоўваліся як носьбіты хрысціянскай маралі. Старцы ў аповесці М. Гарэцкага сквапныя і крывадушныя людзі, якія прыстасоўваюць словы Бібліі да ўласных патрэб, хочуць забраць маленькага сына Антона Іваньку ў павадыры. Галоўны герой дарэмна ўскладае надзею на народную мудрасць і хрысціянскую міласэрнасць старцаў. Яго чакае яшчэ адно

расчараванне, якое яскрава паказана ў сне Антона Жабона. У гэтым сне старцы разам з бацькай Антона выкрадаюць Іваньку, калечаць яго, каб зарабіць больш міластыні.

Расчараванне ў людзях, невыносная адзінота, балючае перажыванне за лёс сваіх дзяцей, якія павінны адказваць за грахі злодзея і п'яніцы дзеда, прыводзяць Антона да крывавага забойства Іванькі ля прыдарожнага крыжа, да своеасаблівай спробы змыць грахі чалавецтва нявіннай кроўю дзіця. Невыпадкова перад забойствам аўтар яшчэ раз напамінае людзям аб дзесяці боскіх запаветах, аб страшным судзе. Толькі гэта жахлівае ахвярапрынашэнне, самазабойства Антона, вар'яцтва яго жонкі прымушаюць адумацца бацьку Антона. Менавіта Аўтуха лічаць сяляне забойцам, менавіта каля яго калышыцца ў паветры Іванькава душа. Толькі гэта сялянская драма прыцягвае ўвагу прадстаўнікоў інтэлігенцыі да праблем вёскі, якія звязаны перш за ўсё з духоўным крызісам, вынікам якога становяцца п'янства, непісьменнасць і беднасць: «Цяпер у майго народа крызіс: старыя багі струпехлі, новых… новыя мала ведамы… і сусветна новыя багі, багі, цела, багі, што даюцьці могуць даць поўнае здаваленне толькі целу, гэтыя багі не надта падабаюцца беларусу… І вот, каб стварыць тып "новага беларуса", каб угадаць, якім павінен ён быць і будзе, гэты ўладар будучыні, трэба памірыць у душы беларуса старое з новым, трэба вышукаць, што ў яго душы жывуча са старыны і на чым будаваць новае… Трэба шукаць прычыны крызісу. Бо п'янства, непісьменнасць, беднота – усё гэта абставы крызіса…» [1, с. 258].

Такім чынам, драматычная аповесць «Антон» М. Гарэцкага мае выразную біблейскую аснову. Герой аповесці аблічам і асобнымі рысамі характару нагадвае Ісуса Хрыста. Як і Хрыстос ён балюча перажывае кожную несправядлівасць, непакоіцца за грахі іншых і строга асуджае сябе. Не хапае яму хрысціянскай цярплівасці, міласэрнасці і здольнасці дараваць. Але нават гэтая загана тлумачыцца абставінамі, у якія трапіў галоўны герой. Жыццё яго нагадвае сапраўднае пекла, дзе прадстаўлены ўсе чалавечыя грахі: распуста, п'янства, сквапнасць, ганарлівасць, крадзёж, непавага да старэйшых і адмаўленне Бога. Сярод паноў і мужыкоў, святароў і інтэлігентаў, рабочых і гандляроў пануе клопат аб задавальненні патрэб цела, прага матэрыяльных каштоўнасцей. Нават старцы з'яўляюцца пародыяй на святых. Сярод такіх герояў просты мужык, які думае аб выратаванні сваёй душы і душы сваіх дзяцей здаецца белай варонай. Аўтар не апраўдвае жудаснае злачынства галоўнага героя, але параўноўвае яго з біблейскім ахвярапрынашэннем Аўраамам свайго сына Ісаака. Для Антона Жабона гэта адзіная магчымасць спыніць ланцуговую рэакцыю грахоў, якія множацца з пакалення ў пакаленне. Душа галоўнага героя просіць паратунку, як просіць супакою нявінная душа забітага маленькага хлопчыка Іванькі. Ці знойдзе яна спакой? Ці адшукае беларус свой шлях да веры? Над гэтымі пытаннямі прымушае задумацца пісьменнік, асэнсоўваючы пошукі веры як сэнс жыцця чалавека.

**Высновы і перспектывы далейшага даследавання**. Аналіз драматычнай аповесці «Антон» дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1) аснову мастацкай канцэпцыі М. Гарэцкага складае біблейска-хрысціянская традыцыя, якая уплывае на форму і змест аповесці;

2) галоўная ідэя драмы ў адлюстраванні духоўнага крызісу, які ахоплівае прадстаўнікоў усіх сацыяльных груп пачатку XX ст. на Беларусі;

3) кафлікт твора пабудаваны на супрацьпастаўленні веры і бязвер'я, духоўнасці і бездухоўнасці;

4) для характарыстыкі галоўнага героя аповесці аўтар выкарыстоўвае вобраз Хрыста;

5) духоўны крызіс паказаны праз сістэму персанажаў, якія сімвалізуюць грахі, згаданыя ў Бібліі;

6) жыццё грамадства атаясамліваецца ў драматычнай аповесці з біблейскім архетыпам пекла;

7) развязка драмы пабудавана на біблейскім сюжэце аб ахвярапынашэнні Аўраамам свайго сына Ісаака;

8) душу беларускага народа сімвалізуе нявінная дзіцячая душа, якая мітусіцца ў пошуках паратунку і супакою;

9) цытаты і рэмінісцэнцыі з Бібліі дапамагаюць пісьменніку адлюстраваць драму духоўнай адзіноты, жыццё чалавечай душы, якая гіне ў барацьбе з грэшным светам.

***Джерела та літаратура***


1. Гарэцкі М. Зб. тв. : у 4 т. Т. 2. Аповесці. Драматычныя абразкі / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 416 с.
2. Кажамякін Г. В. Максім Гарэцкі і біблія / Г. В. Кажамякін // Гарэцкія чытанні : матэрыялы дакл. і паведамл. на Сёмых чытанкях, Мінск, 2—3 чэрв. 1998 г., Восьмых чытаннях, Пінск, 16–18 чэрв. 1999 г.,

Дзевятых чытаннях, 8–9 чэрв. 2000 г., Дзесятых чытаннях, Мінск, 7 чэрв. 2001 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ. – Мінск, 2002. – С. 330–334.
3. Кенька М. Максім Гарэцкі і вера / М. Кенька // Гарэцкія чытанні : матэрыялы дакл. і паведамл. VI чытанняў, Горкі, 18–20 чэрв. 1997 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ. – Мінск, 2000. – С. 66–70.
4. Конан У. Міфалагічныя і біблейскія вобразы і матывы ў творчасці Максіма Гарэцкага / У. Конан // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццёі творчасць : матэрыялы XVII Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 9 красавіка 2009 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ. – Мінск, 2009. – С. 203–208.

**Єрмоленко Олена. Біблія у творчості класика білоруської літератури М. Горецького.** Одним із джерел натхнення білоруського письменника Максима Горецького була Біблія. У статті проаналізовано вплив біблійної традиції на форму й зміст драматичної повісті «Антон». Визначено роль основних християнських архетипів у художній концепції класика.
**Ключові слова:** Біблія, архетип, віра, самотність, душа, гріх, церква, драма, пекло.

**Ермоленко Елена. Библия в творчестве классика белорусской литературы М. Горецкого.** Одним из источников вдохновения белорусского писателя Максима Горецкого была Библия. В статье проанализировано влияние библейской традиции на форму и содержание драматической повести «Антон». Определена роль основных христианских архетипов в художественной концепции классика.
**Ключевые слова:** Библия, архетип, вера, одиночество, душа, грех, церковь, драма, ад.

**Yarmolenka Olena. The Bible in the Belarusian Classicist M. Goretsky's Creative Activity.** The main source of inspiration of the Belarusian writer Maxim Goretsky's creativity was the Bible. The paper analyzes the influence of the biblical tradition on the form and content of the dramatic story «Anton». The main Christian archetypes and their role in the artistic conception of the classic are investigated.
**Key words:** Bible, archetype, faith, solitude, soul, sin, church, drama, hell.

Статья поступила в редколлегию
01.02.2013 г.